**Абрамовіч, С.** Сваіх байцоў Афганістан выпрабоўвае да сённяшняга дня — цяжкімі думкамі і балючымі ўспамінамі / С. Абрамовіч // Наша Талачыншчына. — 2020. — 8 лют. — С. 3.

## СВАІХ БАЙЦОЎ АФГАНІСТАН ВЫПРАБОЎВАЕ ДА СЁННЯШНЯГА ДНЯ — ЦЯЖКІМІ ДУМКАМІ І БАЛЮЧЫМІ ЎСПАМІНАМІ

*Яшчэ ў дапрызыўным узросце Сяргей Смусь і яго равеснікі ведалі, што стануць «афганцамі». Не, іх ніхто афіцыйна не папярэджваў, і варажбітка не прадказвала ім такую будучыню, але хлопцы самі прадчувалі, былі цвёрда ўпэўненыя: праз год-другі, калі пачнецца тэрміновая служба, давядзецца прайсці праз выпрабаванні, праз якія прайшло ўжо нямала землякоў. Вайна была на слыху – у навінах, на кінаэкранах, у паўсядзённых размовах, таму і нядзіўна, што, жывучы ў такой атмасферы, падлеткі падсвядома, на ўзроўні інтуіцыі, спрагназавалі свой армейскі шлях.*

– У мяне быў магнітафон «Астра» з цэлай бабінай песень на афганскую тэму, – успамінае Сяргей Алегавіч. – Я ведаў старэйшых хлопцаў, якія вярнуліся з Афганістана. Напрыклад, Мішу Зевакова з Астрашапак (гэта побач з маёй роднай вёскай Кучына, якой цяпер ужо няма). Ён дэмабілізаваўся ў 86-м, а мяне прызвалі у 87-м (на жаль, Міша трагічна пайшоў з жыцця ўжо тут, на радзіме і ў мірны час). Калі дзе-небудзь у кампаніі заходзіла гутарка пра нашу будучую службу ў арміі, то мы бачылі сябе не іначай як «афганцамі», іншая думка нават у галаву не прыходзіла.

Гэта не значыць, што маладыя людзі самі імкнуліся туды, у небяспеку, шукалі рамантыкі ці вострых адчуванняў, або наіўна верылі ў нейкі міфічны «інтэрнацыянальны доўг». Яны проста ведалі, што такі шлях ім наканаваны і што ніхто не дасць ім права выбару – паставяць задачу, і салдат павінен будзе яе выконваць. Калі спатрэбіцца, то выконваць нават коштам свайго жыцця, як адбылося гэта з Аляксандрам Алюшыным – аднакласнікам і саслужыўцам Сяргея. Пра лёс гэтага юнака, чыё імя сёння носіць піянерская дружына Кохановскай СШ, мы пісалі ў мінулым годзе ў газеце за 6 лютага, а сёлета Сяргей Алегавіч падзяліўся некаторымі падрабязнасцямі з часоў іх сумеснай вучобы і службы.

### ВЫПАДКОВАЯ ДРОБЯЗЬ, БЕЗ ЯКОЙ, МАГЧЫМА, НЕ БЫЛО Б ТРАГЕДЫІ

Хлопцы нават нарадзіліся ў адным месяцы – у жніўні, з розніцай ў два тыдні. Разам вучыліся ў школе і ПТВ, і службу праходзілі ў саракавой арміі кулямётчыкамі ў паветрана-дэсантных войсках, у званні радавых. Маглі б разам і дадому вярнуцца, але ў нейкі момант лёс вырашыў распарадзіцца па-іншаму.

– Пасля васьмі класаў Кохановскай СШ мы з Сашкам і яшчэ некалькі нашых сяброў, чалавек 6–7, вырашылі падацца ў ПТВ № 173 (сёння – Коханаўскі ліцэй сельгасвытворчасці) – аднаўляе Сяргей Алегавіч у памяці даўнія, але незабыўныя падзеі. – Скончылі яго, а 9 лістапада 1987 года ўсю нашу кампанію разам прызвалі. Мы з Сашам прайшлі вучэбку ў горадзе Фергана Узбекскай ССР і павінны былі адным рэйсам ляцець у Кабул. Падымаліся па трапе, Саша ішоў за мною, але ў апошні момант яго вярнулі, бо выявілася, што ў яго нейкая праблема з дакументамі. Ён прыляцеў з іншай партыяй, і трапілі мы ў розныя палкі. Сустрэліся яшчэ адзін раз, гэта была апошняя наша сустрэча. Пра гібель Сашкі я даведаўся, калі вярнуўся на радзіму.

### ПАЎГОДА НА ВАЙНЕ

У Кабуле Сяргееў батальён выконваў разнастайныя ахоўныя функцыі: суправаджэнне транспартных калон у горадзе і ў гарах, ахова шпіталя, дыпламатычных прадстаўніцтваў і інш. Размяшчаўся ён каля вілы тагачаснага кіраўніка краіны Мухамеда Наджыбулы.

– Вілу ахоўвала падраздзяленне нашай арміі, сфарміраванае поўнасцю з афіцэраў (ніжэй за маёра, здаецца, нікога сярод іх я не заўважаў). Былі задзейнічаны і царандойцы (Царандой – афганскае ваенізаванае фарміраванне, міліцыя), але ім ніхто надта не давяраў, яны маглі ў баі, у залежнасці ад сітуацыі, перайсці на бок праціўніка. Мы, напрыклад, у аднаго царандойца неяк спыталі пра зарплату, і ён, адказваючы, між іншым сказаў штосьці ў такім духу: «Пакуль тут нядрэнна плацяць, за гэтых ваюю. Прапануюць больш там – пайду за тых».

Сяргею пашчасціла: экстрэмальныя сітуацыі, звязаныя з непасрэднай пагрозай жыццю (засады, абстрэлы, тэракты і г. д.), абышлі яго бокам, але ўсё роўна кожны дзень, пражыты ў

ахопленай вайною краіне, для любога чалавека будзе моцным псіхалагічным выпрабаваннем. Сяргей праслужыў там 6 месяцаў, і адгалоскі таго перыяду нават сёння час ад часу парушаюць яго душэўную раўнавагу:

– Паглядзіш кіно пра вайну, успаміны як набягуць – і думаеш, думаеш, перад вачамі ўсё праносіцца, нейкая трывога нападае, эмацыянальны цяжар навальваецца, нават жонцы гэты настрой перадаецца і яна пачынае нервавацца, суперажывае мне.

Тым не менш пра свае армейскія будні Сяргей Алегавіч, як і належыць сапраўднаму салдату, распавядае без нараканняў, бадзёра, нярэдка нават з гумарам. Напрыклад, пра тое, як саслужыўцы-мусульмане ахвотна частаваліся салам і свіной тушонкай:

– Кармілі нас у вучэбцы добра, а ў Кабуле не вельмі: грэчка, пярлоўка, галеты і спіртаваныя батоны (запаяныя ў поліэтылен з парамі спірту, каб доўга не сапсаваліся). Мяса, рыбы і малочных прадуктаў у Афганістане мы амаль не бачылі. Неяк прыслалі мне з дому сала. Узбек убачыў і просіць адрэзаць кавалак. Я здзівіўся: «Табе ж нельга», а ён адказвае: «Нічога страшнага, я ноччу з’ем, калі Алах спаць будзе». А іншы не рашаўся паспытаць тушонкі, пакуль яго не супакоілі: «Не бойся, зараз на этыкетцы пра свініну замажам і напішам, што ялавічына».

## З ДАЛЁКАГА СВЕТУ – НА МАЛУЮ РАДЗІМУ

Вярнуўшыся з негасціннай і няўтульнай чужыны, Сяргей даслужыў свой тэрмін у Віцебску, там жа некаторы час жыў і працаваў пасля дэмабілізацыі, але ў рэшце рэшт знайшоў сябе на сваёй малой радзіме. Апошнія 25 гадоў працуе шафёрам у Талачынскім раёне электрасетак.

З землякамі, якія таксама служылі ў Афганістане, падтрымлівае цесную сувязь. Сустрэчы 15 лютага (на афіцыйных мерапрыемствах і ў нефармальных абставінах, у вузкім коле) – абавязковыя. Колькі б гадоў ні прайшло, «афганцам» заўсёды будзе што ўспомніць і, на жаль, будзе каго памянуць, бо не ўсе вярнуліся з далёкага свету на родную зямлю жывымі.

**Сяргей АБРАМОВІЧ**